# ПРАДМОВА

Гэты «Беларуска-рускі слоўнік» адрасаваны найперш вучням і настаўнікам сярэдняй школы. Але, зразумела, карыстацца ім могуць таксама абітурыенты, навучэнцы і выкладчыкі вучылішчаў, каледжаў і тэхнікумаў, студэнты вышэйшых навучальных устаноў.

Слоўнік можа быць выкарыстаны пры перакладах з беларускай мовы на рускую, на занятках па развіццю мовы. У сувязі з тым, што гэты лексікаграфічны даведнік будзе служыць вучэбным дапаможнікам, пры яго ўкладанні ўлічана моўная практыка вучняў.

Слоўнікавы рэестр ўключае болеш за дваццаць тысяч лексічных адзінак, якія не супадаюць з рускімі адпаведнікамі або маюць істотныя фармальныя адрозненні ад іх. Аснову рэестра складае агульнаўжывальная лексіка сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Пададзены таксама абласныя словы, што атрымалі пашырэнне ў мастацкай літаратуры, і найбольш распаўсюджаныя спецыяльныя тэрміны, гістарызмы і неалагізмы.

Беларускія загаловачныя словы размешчаны ў слоўніку ў алфавітным парадку і надрукаваны «тлустымі» літарамі. Яны даюцца ў пачатковай форме: назоўнікі ў назоўным склоне адзіночнага ліку (за выключэннем слоў, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку), прыметнікі ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду, а дзеясловы — у неазначальнай форме.

Загаловачныя словы-амонімы памячаюцца арабскімі лічбамі зверху справа: **гасці́нец**$^{1}$ і **гасці́нец**$^{2}$.

Загаловачнае слова перакладаецца адпаведным у сэнсавых адносінах словам, сінанімічным радам або апісальна:

**абру́с** скатерть
**беспадста́ўны** необоснованный, безосновательный, беспочвенный
**ві́тка** привязь в виде жгута из прутьев

У мнагазначных словах розныя значэнні слова адзначаюцца ў радку арабскімі лічбамі і аддзяляюцца адно ад другога кропкай з коскаю:

**ба́цькаўшчына** 1) отечество, отчизна; 2) родина; 3) отцовское наследство

Калі назоўнік у адным са сваіх значэнняў страчвае форму адзіночнага ліку, пасля парадкавай лічбы гэтага значэння ставіцца памета *мн.*:

**вага́** 1) вес; 2) *мн.* весы

Каб зрабіць больш лёгкім разуменне, часам у дужках даецца тлумачэнне:

**бі́скуп** епископ (*католической церкви*)

З гэтай жа мэтай выкарыстоўваюцца і стылістычныя паметы накшталт *абл., спец., перан.* і інш.:

**адбі́так** 1) отпеча́ток; отображе́ние; 2) *палігр.* о́ттиск; 3) *перан.* след

З устойлівых выразаў у слоўнік уключаны толькі тыя, якія перакладаюцца на рускую мову не даслоўна. Яны змяшчаюцца пры апорных словах і аддзяляюцца ад іх кропкай з коскай:

**вялікі** большой; внушительный; объёмистый; **з вялікай ласкі** по милости; **з вялікага грому малы дождж** гора родила мышь.

Калі загаловачнае слова сустракаецца толькі ў пэўным выразе, пасля такога слова ставіцца двукроп'е, потым ідзе гэты выраз з перакладам:

**дыхт: даць дыхту** задать жару, намылить холку

Калі загаловачнае слова ўжыта ва ўстойлівым выразе ў пачатковай форме, то замест яго пішацца першая літара з кропкай:

**абяцанка** посул; **а. цацанка, а дурню радасць** обещанного три года ждут

Знак націску пастаўлены ва ўсіх словах, за выключэннем аднаскладовых і слоў з націскной літарай ё.

У аснову слоўніка пакладзены матэрыялы акадэмічных выданняў — «Слоўніка беларускай мовы» (1987), «Беларуска-рускага слоўніка» (1988-1989), «Русско-белорусского словаря» (1993). Выкарыстаны таксама «Слоўнік іншамоўных слоў» А. М. Булыкі (1999), «Кароткі слоўнік беларускай мовы» Г. У. Арашонкавай і В. П. Лемцюговай (1994), «Самабытнае слова» І. Р. Шкраба (1994), «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (1996), «Орфографический словарь русского языка» (2002), «Большой словарь иноязычных слов» А. М. Булыкі (2004) і іншыя лексікаграфічныя працы, асабістыя назіранні складальнікаў над моваю прэсы.

# Спіс скарачэнняў

| | | |
|---|---|---|
| *абл.* | — | абласное слова |
| *ав.* | — | авіяцыя |
| *анат.* | — | анатомія |
| *архіт.* | — | архітэктура |
| *астр.* | — | астраномія |
| *афіц.* | — | афіцыяльнае слова |
| *бат.* | — | батаніка |
| *біял.* | — | біялогія |
| *буд.* | — | будаўнічая справа |
| *бухг.* | — | бухгалтарскі тэрмін |
| *ваен.* | — | ваенная справа |
| *вет.* | — | ветэрынарыя |
| *выс.* | — | слова высокага стылю |
| *геад.* | — | геадэзія |
| *геал.* | — | геалогія |
| *геагр.* | — | геаграфія |
| *гідр.* | — | гідралогія |
| *гіст.* | — | гістарызм |
| *гл.* | — | глядзі |
| *горн.* | — | горная справа |
| *грам.* | — | граматыка |
| *жыв.* | — | жывапіс |
| *заал.* | — | заалогія |
| *збор.* | — | зборны назоўнік |
| *зневаж.* | — | зневажальнае слова |
| *канц.* | — | канцылярскае слова |
| *карт.* | — | картачны тэрмін |
| *кніжн.* | — | кніжнае слова |
| *крав.* | — | кравецкая справа |
| *кул.* | — | кулінарыя |
| *ласк.* | — | ласкальная форма |
| *лаянк.* | — | лаянкавае слова |
| *лес.* | — | лесаводства |
| *лінгв.* | — | лінгвістыка |
| *літ.* | — | літаратуразнаўства |
| *лог.* | — | логіка |
| *мар.* | — | марская справа |
| *мат.* | — | матэматыка |
| *мед.* | — | медыцына |
| *метэар.* | — | метэаралогія |
| *мін.* | — | мінералогія |
| *міф.* | — | міфалогія |
| *мн.* | — | множны лік |

*муз.* — музыка
*нар.-паэт.* — народнапаэтычнае слова
*неадабр.* — неадабральнае слова
*пагардл.* — пагардлівае слова
*палігр.* — паліграфія
*паліт.* — палітычны тэрмін
*паляўн.* — паляўніцтвазнаўства
*памянш.* — памяншальная форма
*памянш.-ласк.* — памяншальна-ласкальная форма
*паэт.* — паэтыка
*пед.* — педагогіка
*перан.* — пераноснае значэнне
*радыё* — радыётэхніка
*разм.* — размоўнае слова
*рыб.* — рыбалоўства
*рэл.* — рэлігія
*с.-г.* — сельская гаспадарка
*сад.* — садоўніцтва
*спарт.* — спартыўны тэрмін
*спец.* — спецыяльны тэрмін
*стал.* — сталярная справа
*тэатр.* — тэатральны тэрмін
*тэкст.* — тэкстыльная справа
*тэх.* — тэхніка
*уст.* — устарэлае слова
*фальк.* — фальклор
*фам.* — фамільярнае слова
*фарм.* — фармакалогія
*фіз.* — фізіка
*фізіял.* — фізіялогія
*філас.* — філасофія
*фін.* — фінансавая справа
*фота* — фатаграфія
*хім.* — хімія
*царк.* — царкоўнае
*цясл.* — цяслярская справа
*чыг.* — чыгуначны тэрмін
*шав.* — шавецкая справа
*шахм.* — шахматны тэрмін
*школ.* — школьнае слова
*эк.* — эканоміка
*эл.* — электратэхніка
*этн.* — этнаграфія
*юр.* — юрыспрудэнцыя

# БЕЛАРУСКІ АЛФАВІТ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Аа** | **Зз** | **Пп** | **Цц** |
| **Бб** | **Іі** | **Рр** | **Чч** |
| **Вв** | **Йй** | **Сс** | **Шш** |
| **Гг** | **Кк** | **Тт** | **Ыы** |
| **Дд (Дж, дж, Дз, дз)** | **Лл** | **Уу** | **Ьь** |
| **Ее** | **Мм** | **Ўў** | **Ээ** |
| **Ёё** | **Нн** | **Фф** | **Юю** |
| **Жж** | **Оо** | **Хх** | **Яя** |

***Заўвага.*** Дыграфы Дж, Дз пры размяшчэнні слоў у алфавітным парадку разглядаюцца кожны як дзве літары.
Апостраф пад увагу не прымаецца.

# А

**аáзіс** оáзис
**абáбак** подберёзовик
**абабéганы (аббéганы)** обéганный, оббéганный; обры́сканный
**абабéгаць (аббéгаць)** обéгать, оббéгать; обры́скать
**абабíты** 1) оби́тый, обши́тый; 2) сби́тый; 3) ссáженный; 4) обмолóченный; 5) укáтанный, уéзженный
**абабíць** 1) оби́ть, обши́ть; 2) сбить (*ударяя, заставить отвалиться*); 3) ссади́ть (*локоть, колено*); 4) обмолоти́ть; 5) укатáть, уéздить (*дорогу*)
**абабрáны** 1) обóбранный; 2) очи́щенный, облу́пленный; 3) обóбранный (*обкраденный*)
**абабрáць** 1) обобрáть (*плоды*); 2) очи́стить, облупи́ть (*скорлупу, кожуру*); 3) обобрáть (*обокрасть*)
**абавя́зак** обя́занность; долг
**абавя́заны** обя́занный
**абавязáцельства** обязáтельство
**абавязáць** обязáть (*кого*); вмени́ть в обя́занность (*кому*)
**абавязкóва** обязáтельно, непремéнно
**абавязкóвасць** обязáтельность
**абавязкóвы** обязáтельный, непремéнный
**абагаўлéнне** обожествлéние
**абагачáльнасць** *спец.* обогащáемость
**абагачáльнік** обогати́тель
**абагачáльны** обогати́тельный
**абагачáць** обогащáть
**абагнáць** 1) обогнáть; 2) *с.-г.* оку́чить, опахáть
**абагнýты** обóгнутый
**абагравáльны** обогревáтельный; отопи́тельный (*сезон*)
**абагрэ́ты** обогрéтый; отóпленный
**абагрэ́ць** обогрéть; отопи́ть (*помещение*)
**абагу́ленне** обобществлéние
**абагу́лены** обобществлённый
**абагу́ліць** обобществи́ть
**абагульнéнне** обобщéние
**абагу́льнены** обобщённый
**абагульнíць** обобщи́ть
**абаджгáны** 1) иску́санный, изжáленный; 2) обожжённый, острекáвленный
**абаджгáць** 1) искусáть, изжáлить (*о насекомых*); 2) обжéчь, острекáть (*о крапиве*)
**абадзьму́ты (абдзьму́ты)** обду́тый
**абадзьму́ць (абдзьму́ць)** обду́ть
**абадóк** ободóк
**абадрáнец** *разм.* оборвáнец, обóрвыш
**абадрáны** 1) обóдранный; 2) оцарáпанный; 3) очёсанный
**абадрáць** 1) ободрáть (*кору, оболочку*); 2) оцарáпать; 3) очесáть (*очистить от коры*)
**абажуратрымáльнік** абажуродержáтель
**абакрáдзены (абкрáдзены)** обворóванный, обкрáденный
**абакрáсці (абкрáсці)** обворовáть, обокрáсть
**абалóна** 1) пóйма; 2) зáболонь, оболóнь
**абалóнка** 1) оболóчка; 2) *спец.* рубáшка; 3) *абл.* стеклó в окнé
**абамлéлы** 1) лиши́вшийся чу́вств; 2) помертвéвший
**абамлéнне** 1) óбморочное состоя́ние; 2) помертвéние (*оцепенение*)
**абамлéць** 1) упáсть в óбморок; 2) помертвéть (*оцепенеть*)
**абанемéнт** абонемéнт
**абанéнт** абонéнт
**абанíраваць** абони́ровать
**абанкру́ціцца** обанкрóтиться
**абáпал (паабáпал)** с обéих сторóн; по обéим сторонáм
**абапéрці (апéрці)** оперéть, прислони́ть; облокоти́ть (*руку*)
**абапёрты** опёртый; облокóченный
**абапрэ́ць** опрéть, обопрéть
**абараназдóльнасць** обороноспосóбность
**абараназдóльны** обороноспосóбный
**абарáнак** 1) барáнка, бу́блик; **зарабíць на абарáнкі** достáться на калачи́ (на орехи), **абарáнкам не завáбіш** кала-

чо́м не зама́нишь; 2) *разм.* бара́нка (*рулевое колесо*)
**абарані́ць** 1) оборони́ть; защити́ть; 2) отстоя́ть (*права*)
**абара́нкам** кре́нделем, кала́чиком; **хвост а.** хвост пистоле́том
**абараня́льны** защи́тный; защити́тельный
**абара́ць** опаха́ть
**абарача́льнасць** обора́чиваемость, обраща́емость (*капитала*); обрати́мость
**абарача́льны** обрати́мый
**абарача́ць** 1) *фальк.* обора́чивать, обраща́ть; 2) склоня́ть к чему-л.
**абарачэ́нне** 1) оборо́т; 2) *эк.* обраще́ние; **грашо́вае а.** де́нежное обраще́ние
**абарва́ны** 1) со́рванный; 2) обо́рванный; 3) одёрнутый
**абарва́ць** 1) сорва́ть; 2) оборва́ть; 3) *перан.* одёрнуть
**абармо́т** *разм.* обормо́т, плут, пройдо́ха
**абаро́на** 1) оборо́на; защи́та; 2) покрови́тельство
**абаро́нены** 1) оборо́ненный; защищённый; 2) отсто́янный
**абаро́нны** оборо́нный; защи́тный; оборони́тельный
**абаро́нца** 1) защи́тник; 2) побо́рник (*сторонник*)
**абаро́нчы** 1) оборони́тельный; 2) *паліт.* оборо́нческий
**абаро́чвацца** 1) опроки́дываться; 2) обора́чиваться, огля́дываться; 3) *эк.* обраща́ться
**абаро́чваць** опроки́дывать, перевора́чивать
**аба́т** абба́т
**абаткну́ты** 1) обты́канный; 2) законопа́ченный, уты́канный
**абаткну́ць** 1) обты́кать; 2) законопа́тить, уты́кать
**абаты́са** аббати́са
**аба́цтва** абба́тство
**аба́члівасць** 1) осмотри́тельность, предосторо́жность; 2) сочу́вственность; 3) чу́ткость, забо́тливость
**аба́члівы** 1) осмотри́тельный; 2) сочу́вственный; 3) чу́ткий, забо́тливый
**абая́льнасць** обая́тельность
**абая́льны** обая́тельный
**аббе́ганы** *гл.* **абабе́ганы**
**аббе́гаць** *гл.* **абабе́гаць**
**аббудава́ць** обстро́ить
**аббэ́рсаць** *разм.* опу́тать, небре́жно обвяза́ть
**абвадня́льны** обводни́тельный
**абва́жаны** обве́шенный
**абва́жыць** обве́сить
**абвалака́льны** обволо́кивающий
**абвалачы́** 1) обволо́чь; 2) обтащи́ть
**абвалі́ць** 1) обвали́ть, обру́шить; 2) повали́ть, свали́ть
**абвандрава́ць** объе́хать, обойти́, путеше́ствуя; исколеси́ть
**абвастры́ць** обостри́ть; накали́ть (*отношения*)
**абвастрэ́нне** обостре́ние; нака́ливание; изощре́ние
**абве́дзены** обведённый; оче́рченный, окаймлённый
**абве́зены** обвезённый
**абве́зці** обвезти́
**абве́йваць** *с.-г.* обве́ивать
**абве́ргнуты** опрове́ргнутый
**абве́ргнуць** опрове́ргнуть
**абве́сны: а. лад** *грам.* изъяви́тельное наклоне́ние
**абве́стка** объявле́ние, оповеще́ние
**абве́сці** обвести́; очерти́ть, окайми́ть
**абве́тралы** обве́тревший
**абве́траны** обве́тренный
**абве́траць** обве́треть
**абве́яць** 1) *с.-г.* обве́ять; 2) ове́ять; обду́ть
**абвінава́ўца** 1) *юр.* обвини́тель; 2) изобличи́тель, обличи́тель
**абвінава́ўчы** 1) *юр.* обвини́тельный; 2) изобличи́тельный; обличи́тельный
**абвінава́чваны** *юр.* обвиня́емый
**абвінава́ціць** 1) обвини́ть; 2) изобличи́ть, обличи́ть; уличи́ть
**абвіну́ць** оберну́ть, оберну́ть, заверну́ть

**абво́странасць** обострённость; накалённость
**абво́страны** обострённый; накалённый
**абву́гліцца** обу́глиться
**абвы́кнуць** привы́кнуть, свы́кнуться
**абвя́лы** 1) привя́нувший; привя́дший (*о растениях*); 2) обмя́кший; сни́кший
**абвя́нуць** *гл.* **абвя́ць**
**абвяржэ́нне** опроверже́ние
**абвясці́ць** 1) объяви́ть; провозгласи́ть; 2) предвозвести́ть; 3) огласи́ть
**абвя́ць (абвя́нуць)** 1) привя́нуть; пони́кнуть (*о растениях*); 2) *перан.* обмя́кнуть; сни́кнуть
**абвяшча́льнік** провозгласи́тель
**абгаблява́ны (агаблява́ны)** обстро́ганный, обстру́ганный
**абгаблява́ць (агаблява́ць)** обстрога́ть, обструга́ть
**абгавары́ць** 1) обсуди́ть; 2) оговори́ть, оклевета́ть, очерни́ть, оха́ять
**абгаво́р** огово́р; злосло́вие
**абгаво́раны** 1) обсуждённый; 2) оговорённый, оклеве́танный, очернённый, оха́янный
**абгаво́рванне** 1) обсужде́ние; 2) огова́ривание, клевета́, спле́тничание
**абганя́лка** *с.-г.* пропа́шник
**абгарадзі́ць (агарадзі́ць)** огороди́ть; обне́сти огра́дой
**абгарну́ць** 1) оберну́ть, оберну́ть; 2) осы́пать, оку́чить (*землёй*)
**абгіна́ць** огиба́ть
**абгле́дзець** осмотре́ть
**абгні́лы** обгни́вший
**абгні́сці** обгни́ть
**абго́йсаць** *разм.* обры́скать; вы́бегать
**абго́рнуты** 1) обёрнутый, обвёрнутый; 2) осы́панный, оку́ченный
**абго́ртачны** обёрточный
**абго́ртка** 1) обёртка, обвёртка; 2) *бат.* обвёртка
**абгрунтава́насць** обосно́ванность; осно́вательность; состоя́тельность
**абгрунтава́нне** обоснова́ние
**абгрунтава́ны** обосно́ванный
**абгрунтава́ць** обоснова́ть
**абгрунто́ўванне** обоснова́ние
**абгры́зці** обгры́зть; обглода́ть
**абгу́льванне** о́быгрыш
**абдары́ць** одари́ть
**абдзьму́ты** *гл.* **абадзьму́ты**
**абдзьму́ць** *гл.* **абадзьму́ць**
**абдзьму́хаць** обду́ть
**абдзьму́хванне** обдува́ние
**абдзялі́ць** 1) обдели́ть, лиши́ть; 2) надели́ть, одели́ть
**абдзяўбці́** 1) обклева́ть; 2) обдолби́ть
**абдра́пацца** оцара́паться
**абду́мацца** оду́маться; опо́мниться; спохвати́ться
**абду́раны** обма́нутый, одура́ченный, наду́тый, околпа́ченный
**абдуры́ць** обману́ть, одура́чить, наду́ть, околпа́чить
**абдымі́ць** *разм.* 1) обда́ть ды́мом; 2) задыми́ть, закопти́ть
**абды́мны** охва́тывающий, охва́тный
**або́дзве** обе
**абе́днены** обеднённый
**абезгало́віць** обезгла́вить
**аб’е́здзіць** 1) объе́здить, изъе́здить; 2) нае́здить, вы́ездить (*приучить к езде лошадь*); 3) обката́ть (*машину*)
**абезнадзе́ены** обезнадёженный
**абезнадзе́іць** обезнадёжить
**абе́руч** обе́ими рука́ми
**абескалярó́ўваць** обесцве́чивать
**абе́чак** обеча́йка (*в решете*)
**абжы́ты** обжито́й, обжи́тый
**абза́** кро́мка (*край доски*)
**абзаве́сціся** обзавести́сь
**абзада́чыць** внести́ зада́ток (*за что*)
**абзеляні́ць** вы́зеленить
**абібо́к** *разм.* лежебо́ка; лентя́й
**абіва́льшчык** обо́йщик
**абі́вачны** обо́йный, оби́вочный
**аб’і́нець** заиндеве́ть, покры́ться и́нем
**абі́ркі** отхо́ды; очи́стки
**абі́ўка** оби́вка; обши́вка (*дощатая, железная*)
**абіўны́** обо́йный, оби́вочный, обши́вочный

**абкалаці́ць** обтрясти́
**абкаме́чаны** обмя́тый
**абкамячы́ць** обмя́ть
**абкапа́ны (акапа́ны)** 1) око́панный, обры́тый; 2) оку́ченный
**абкапа́ць (акапа́ць)** 1) окопа́ть, обры́ть; 2) оку́чить (*картофель*)
**абкарэ́лы** заскору́злый
**абкарэ́ць** заскору́знуть
**абка́тны** *спец.* обкатно́й, обка́тный
**абкі́даць** 1) заброса́ть, обкида́ть; 2) *крав.* обмета́ть
**абкітава́ны** зама́занный
**абкітава́ць** зама́зать (*заделать замазкой*)
**абкіто́ўка** зама́зка
**абклада́ць** 1) обкла́дывать; 2) обёртывать, обвёртывать; 3) облага́ть (*налогом, штрафом*); 4) отвора́чивать, опуска́ть; 5) завола́кивать, обвола́кивать (*о тучах*); 6) отора́чивать, обшива́ть
**абко́пка** око́пка
**абко́ўзаны** 1) обка́танный; 2) обмя́тый, измя́тый
**абко́ўзаць** 1) обката́ть; 2) обмя́ть, измя́ть
**абкра́дзены** *гл.* **абакра́дзены**
**абкра́сці** *гл.* **абакра́сці**
**абкру́жаны** 1) окружённый; 2) оце́пленный; 3) обойдённый; 4) *паляўн.* обло́женный
**абкружы́ць** 1) окружи́ть; 2) оцепи́ть; 3) обойти́, обежа́ть, объе́хать; 4) *паляўн.* обложи́ть
**абкруці́ць** 1) обмота́ть; окрути́ть; 2) оберну́ть, заверну́ть; 3) *разм.* окрути́ть, ожени́ть
**абкру́чаны** 1) обмо́танный; окру́ченный; 2) обёрнутый (*чем*), завёрнутый (*во что*); 3) *разм.* окру́ченный
**абкуро́дымець** *разм.* закопти́ться, покры́ться ко́потью
**абкуро́дыміць** *разм.* закопти́ть, покры́ть ко́потью
**абла́ва** обла́ва
**аблаву́хі** вислоу́хий, лопоу́хий
**абла́дзіць** 1) привести́ в поря́док; 2) обде́лать, обрабо́тать (*выгодно устроить*)
**аблаго́дзіць** *разм.* сде́лать кро́тким, добродушным, незло́бным, покла́дистым
**аблажы́ць** 1) обложи́ть; 2) оберну́ть; 3) отверну́ть, опусти́ть; 4) *ваен.* осади́ть; 5) оторо́чить
**абла́зіць**[1] обла́зить, изла́зить
**абла́зіць**[2] 1) облеза́ть, линя́ть; 2) облу́пливаться
**аблако́чвацца** облока́чиваться
**абласны́** областно́й
**аблаташы́ць** обобра́ть (*сад*)
**аблачы́на** о́блачко
**абла́шчыць** обласка́ть
**абла́яны** обру́ганный, вы́руганный
**абла́яць** обруга́ть, вы́ругать
**абле́гчы** 1) обле́чь; 2) свали́ться (*заболеть*)
**абле́злы** 1) обле́злый; облиня́лый; 2) *разм.* полиня́лый; 3) облупи́вшийся
**абле́зці** 1) обле́зть; облиня́ть; 2) *разм.* полиня́ть; 3) облупи́ться
**аблі́пка: у аблі́пку** в обтя́жку
**аблі́пнуць** 1) обли́пнуть; 2) пло́тно обле́чь
**аблі́ты** 1) обли́тый; 2) ока́ченный, о́бданный; **як ва́рам а.** сло́вно кипятко́м ошпа́ренный
**аблі́ць** 1) обли́ть; 2) окати́ть, обда́ть
**аблі́чаны** 1) обсчи́танный; 2) *разм.* сосчи́танный
**аблі́чча** 1) о́блик, о́браз; 2) лицо́, черты́ лица́; **паказа́ць сваё** (*сапраўднае*) **а.** показа́ть своё (*настоящее*) лицо́
**аблічы́ць** 1) обсчита́ть; 2) *разм.* сосчита́ть
**абло́га** 1) *ваен.* оса́да, обложе́ние; 2) *с.-г.* обло́г, за́лежь; 3) *паляўн.* окла́д
**абло́жаны** 1) обло́женный; 2) обвёрнутый; 3) отвёрнутый, опу́щенный; 4) *ваен.* осаждённый; 5) оторо́ченный
**аблуза́ць** облущи́ть
**аблупі́ць** облупи́ть; ободра́ть; **а. як лі́пку** ободра́ть как ли́пку

**аблу́плены** облу́пленный; обо́дранный
**аблу́шчаны** облущённый
**аблы́таны** опу́танный
**аблы́таць** опу́тать
**аблямава́ны** оторо́ченный, окаймлённый
**аблямава́ць** оторо́чить, окайми́ть
**аблямо́ўка** оторо́чка, обши́вка, кайма́
**абмакрэ́ць** намо́кнуть, обмо́кнуть
**абмалёўка** 1) окра́ска; 2) описа́ние, обрисо́вка; изображе́ние
**абмалява́ны** 1) окра́шенный; 2) *перан.* опи́санный, обрисо́ванный; изображённый
**абмалява́ць** 1) окра́сить; 2) *перан.* описа́ть, обрисова́ть; изобрази́ть
**абматы́чыць** обрабо́тать моты́гой, тя́пкой
**абма́цаны** 1) ощу́панный; 2) обша́ренный
**абма́цаць** 1) ощу́пать; 2) обша́рить
**абмежава́льнік** *тэх.* ограничи́тель
**абмежава́насць** 1) ограни́ченность; стеснённость; 2) ограни́ченность, недалёкость
**абмежава́нне** 1) ограниче́ние, стесне́ние; 2) обмежёвка
**абмежава́ны** 1) ограни́ченный; стеснённый; 2) обмежёванный
**абмежава́ць** 1) ограни́чить; стесни́ть; 2) обмежева́ть
**абме́нены** обменённый
**абме́раны** обме́ренный
**абме́раць** обме́рить
**абмеркава́ць** обсуди́ть; обду́мать
**абме́сці** обмести́
**абме́цены** обметённый
**абміну́ты** 1) обо́гнутый; 2) обо́гнанный
**абміну́ць** 1) минова́ть, обогну́ть; 2) *перан.* избежа́ть; 3) обогна́ть, объе́хать
**абмо́віцца** обмо́лвиться, оговори́ться
**абмо́ўка** обмо́лвка
**абму́ляны** стёртый, натёртый
**абмуля́ць** стере́ть, натере́ть (*холку*)
**абмэблява́ць** меблирова́ть
**абмярцве́лы** омертве́лый
**абмярцве́ць** омертве́ть
**абнадзе́ены** обнадёженный
**абнадзе́іць** обнадёжить
**абні́мкі** объя́тия
**абняду́жаць** ослабе́ть, потеря́ть си́лы
**абнясла́віць** обессла́вить, опозо́рить, обесче́стить, осрами́ть
**абнясла́ўлены** обессла́вленный, опозо́ренный, обесче́щенный, осрамлённый
**або́** и́ли; ли́бо; а та́кже
**або́два** о́ба
**або́ддзе** обо́дья
**або́зня** сара́й (*для телег и повозок*)
**або́ймы** обрамле́ние, окруже́ние
**або́ра**[1] обо́ра (*веревка у лаптей*)
**або́ра**[2] *уст.* коро́вник
**або́рка** то́нкая верёвка; бечёвка
**абпа́л** *тэх.* о́бжиг
**абпаўзці́** оползти́
**абплы́сці** оплы́ть
**абрабава́ны** огра́бленный
**абрабава́ць** огра́бить
**абрабі́ць** 1) обрабо́тать, возде́лать; 2) обде́лать (*прида́ть ну́жный вид*); 3) запа́чкать
**абра́давы** обря́довый, обря́дный
**абрадзі́цца** *разм.* роди́ть
**абража́льнік** оскорби́тель
**абра́жаны** оскорблённый; уязвлённый
**абра́з** ико́на, о́браз
**абра́за** оскорбле́ние
**абра́зіць** оскорби́ть; уязви́ть
**абразкі́** *літ.* зарисо́вки, карти́нки; миниатю́ры
**абра́злівы** оскорби́тельный
**абразны́** обрезно́й
**абрасі́ць** 1) ороси́ть, окропи́ть; 2) намочи́ть росо́й
**абрахма́нены** приручённый
**абрахма́ніць** приручи́ть
**абро́блены** 1) обрабо́танный, возде́ланный; 2) обде́ланный; 3) запа́чканный
**абро́жак** *абл.* оше́йник
**абро́к**[1] *гіст.* обро́к